View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Г.Я. Адамовіч**

# У падмурку Бацькаўшчыны – “Вянок” Максіма Багдановіча

Адамовіч, Г.Я. У падмурку Бацькаўшчыны – “Вянок” Максіма Багдановіча / Г.Я. Адамовіч // Кніга новага жыцця : матэрыялы Міжнар.навук.-практ.канф., г. Мінск, 26 ліст. 2013 г. / Літ.музей М.Багдановіча; уклад. М.М. Запартыка, І.У.Шорац. – Мінск : РІВШ, 2014. С. 5-9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1960-я гг. на пачатку палётаў у космас разгарнуліся спрэчкі, які твор з’яўляецца лепшым стварэннем чалавецтва, вартым таго, каб яго, дзеля захавання, адправіць на Месяц? У капсуле быў змешчаны раман “Вайна і мір” Л. Талстога.

А які з твораў беларускай літаратуры варты таго ж? Сучасныя студэнты называюць “Новую зямлю” Я. Коласа, “Палескую хроніку” І. Мележа, “Каласы пад сярпом тваім” У. Караткевіча… і сярод іншых – “Вянок” М. Багдановіча.

Кніга “Вянок” сведчыць пра вечнае, хоць і звернута ў мінулае. Гэта міфалагічныя, фальклорныя сюжэты і вобразы ці стылізацыя пад іх; гістарычнае мінулае Беларусі; замалёўкі тагачаснага горада. І вечная тэма мацярынства. Тое, што адраджаецца наноў і наноў, што можа быць хуткаплынным, крохкім, але пераходзіць у вечнасць. Сімвалам плённага мінулага выступае “блёклы, высахшы лісток” [1, 1, с. 51], здольны абудзіць памяць, успаміны, пачуцці.

“Вянок” – паэтычны сімвал вечнасці і запавет цяжка хворага чалавека, вельмі кароткае жыццё якога ніяк не суадносіцца з вечнасцю, але менавіта таму можа быць “адрасавана” ў далёкую будучыню. Праўда, у кнізе няма чалавека – такога вобраза, як, напрыклад, Міхал або дзядзька Антось з паэмы Я. Коласа, вобраза, што мог бы сведчыць аб упартасці і нескаронасці, аб працавітасці чалавека, яго здольнасці ісці наперад і падымацца ўверх з якой заўгодна ямы, у што верылі вялікія гуманісты. Такога чалавека ў “Вянку” няма. Але ім паўстае сам аўтар “Вянка”. Такім, як любімыя героі класічнай літаратуры, ды і не толькі яе. Невыпадкова, шмат творчых прац прысвечана адной толькі асобе паэта.

Менавіта яму мог бы адрасаваць свае словы амерыканскі пісьменнік У. Фолкнер у сваёй знакамітай Нобелеўскай прамове (1949 г.): “Я веру ў тое, што чалавек не толькі выстаіць – ён пераможа. Ён бессмяротны не таму, што толькі ён адзін валодае непазбыўным голасам, але і таму, што мае душу, дух, здольны да спачування, самаахвярнасці і тярплівасці. Абавязак паэта, пісьменніка палягае якраз у тым, каб пісаць пра тое. Яго прывілея заключаецца ў тым, каб, узвышаючы чалавечыя сэрцы, адраджаючы ў іх

мужнасць і гонар, і надзею, і гордасць, і спачуванне, і шкадаванне, і ахвярнасць, якія складалі славу чалавека ў мінулым, дапамагчы яму выстаяць. Паэт павінен не проста ствараць летапіс чалавечага жыцця; яго твор можа стаць фундаментам, стаўпом, які падтрымлівае чалавека, дапамагае яму выстаяць і перамагчы” [5, с. 192].

Такім творам, што стаў фундаментам, “стаўпом” не толькі для асобнага чалавека, чытача-беларуса, але і для цэлай нацыі, з’яўляецца Кніга М. Багдановіча.

Вянок сплецены ўмела, хоць і слабой рукой, рукой чалавека, які заўсёды церпіць паражэнне перад тварам Смерці. Але ён падобны Фарынаце – герою Дантэ, які велічна ўстае сярод пакутаў Пекла: “Казалось, Ад с презреньем озирал” [3, с. 79]. Гэты чалавек рухаецца, імкнецца ажыццявіць і ажыццяўляе самае добрае, самае лепшае, што ёсць у яго душы, што ён можа зрабіць у такі кароткі прамежак часу. З палкім жаданнем пражыць сваё жыццё з найбольшай самааддачай, рэалізаваць за кароткі тэрмін самае істотнае з таго, што чалавек мог бы зрабіць за 70 і болей гадоў свайго існавання, – такой і выступае асоба Максіма Багдановіча…

Можна прапанаваць яшчэ адзін, метафарычны, пункт гледжання. Л.М. Гумілёў выкарыстаў метафару вялікага гістарычнага мікраскопа, каб набліжаць і разглядаць больш дробныя падзеі, прыкметы, дэталі [2]. Па аналогіі мы можам ужыць метафару касмічнага карабля, які пакідае маленькую кропку на зямлі – “родны кут”, пралятае над тэрыторыяй Беларусі, каб, адарваўшыся ад Зямлі, узяць курс да іншых даляглядаў. Таму ў прынцыпе ў чалавека ёсць тры Бацькаўшчыны.

Першы “прыпынак”, самы блізкі варыянт: Бацькаўшчына – гэта “малая радзіма”, “родны кут”.

Другі варыянт: Бацькаўшчына – гэта ўся Беларусь на планеце Зямля і сярод народаў, што насяляюць яе.

Калі падымацца ўверх, пакідаючы паміж сабой і Зямлёй ладны кавалак касмічнай прасторы, што ў думках адбывалася не адно стагоддзе, тады Бацькаўшчына – гэта той блакіты шарык, які адлятае ўдалячынь, падобна надзьмутаму геліем шарыку, які ўздымаецца ў неба з рук дзіцёнка.

Чым з’яўляецца “Вянок” Багдановіча для Бацькаўшчыны ў розных яе вымярэннях: “роднага кута”, для Беларусі, для планеты Зямля – для той часткі сусветнай прасторы, якую чалавек можа назваць Бацькаўшчынай? І якімі сваімі бакамі адбілася гэта Бацькаўшчына ў кнізе паэта?

Найперш, у дачыненні да “роднага кутка”, гэта кніга выступае адным з яго падмуркаў: тут прадуць свае паясы слуцкія ткачыхі… тут летапісец “спісвае старанна “ад слова і да слова / З даўнейшых граматак пра долю Магілёва” [1, 1, с. 86]… дзяк Гапон зрабіў “няхітрую прыпіску… дзеля душы… ў месце Ваўкавыску” [1, 1, с. 89]… а “вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць” [1, 1, с. 96]… У падмурку паэтавага натхнення – праца слуцкіх, магілёўскіх, ваўкавыскіх руплівцаў… Засталіся нашчадкам і слуцкія паясы, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

летапіс, і псалтыр… “Вянок” паэтызуе гэту спадчыну, адухаўляе яе натхненнем вялікага песняра.

Так, паэт сумуе з прычыны цяжкага становішча працоўнага чалавека на гэтай зямлі. Але ж Бацькаўшчына – гэта не тая Беларусь, якая распрадаецца па кавалках, па “малых радзімах”… Таму гэты сум застаецца і сёння. Бацькаўшчына – гэта не тыя гарады, дзе з каменняў выбіваюцца грошы, – з іх выбіваюцца іскры натхнення. Гэта не тыя лясы, якія вырубаюцца на продаж, – у яго лясах жывуць жывыя, адухоўленыя істоты…лесуны… пугач.

Калі Бацькаўшчына – Беларусь, можна ўвайсці ў лес і паслухаць, як “тонкаствольныя сосны звіняць” [1, 1, с. 52]… пaглядзецца ў люстэрка лесуна – лясное возера… тут сабраліся добрыя знаёмыя – лясун, пугач, змяіны цар, русалкі… У кнізе аднаўляюцца і набываюць “вечнае” пераўвасабленне вобразы роднай зямлі. Кніга “Вянок” выходзіць за часава-прасторавы кантынуум уласна мастацкай рэальнасці і ўключаецца ў кантынуум больш шырокі – у прастору і час існавання Бацькаўшчыны як духоўнай і матэрыяльнай прасторы, што надае беларусам пэўную (і трывалую) аснову “быць беларусамі” сярод іншых нацый, фарміруе напрамкі самавызначэння – “людзьмі звацца”.

На планеце Зямля, як і ў мастацкім свеце Багдановіча, ёсць гарады і вёскі, лясы і азёры… На ёй з’явілася некалі і крыніца Гіпакрэна, і чарадзейны конь Пегас, апетыя таксама Максімам… У дачыненні да планеты Зямля “Вянок” – гэта каралі, карункі, у якія апранулася блакітная зорка, якая ззяе недзе ў мінулым, калі ляцець да іншых планет, да зорак… Гэта кніга саграе цеплынёю паэтавай душы, замілаванасцю перастворaных вобразаў, зваротам да нечага па-дзіцячы пяшчотнага (“Ах, колькі ёсць красы цудоўнай поруч з намі, / Калі глядзець вакол дзіцячымі вачамі!” [1, 1, с. 244]), таго, што здольнае нагадваць аб дзяцінстве, аб маці, аб тым, што засталося ў мінулым, але працягвае сваё існаванне ў нейкай іншай сферы – сферы высокіх пачуццяў, якія не павінны быць заменены высокімі тэхналогіямі… Таму што “Вянок” агортвае Зямлю хвалямі такіх уражанняў, што ўзрастаюць і могуць вырасці толькі ў душы чалавека. Удалечыні ад Зямлі ўжо не відаць нейкія канкрэтныя вобразы, толькі ціха свеціцца цяплом сама Зямля, абгорнутая, паэтызаваная, апетая ў “Вянку”.

Так, распрадаюцца і мадэрнізуюцца ў наш час Гіпакрэна, стаўшы не крыніцай чыстай вады, а грашовым мяшком. Мадэрнізуюцца лесуны і вадзянікі, якія ў савецкім мастацтве набылі смешнае адзенне, а цяпер іх месца занялі пачварныя істоты: вампіры, пярэваратні, дэманы. Замест паэтызацыі, уласна высокай паэзіі наш час прапаноўвае трылер…

Якія веды нясе ў глыбіні космасу карабель над назвай “Вянок” Максіма? І тое, што ўсе мы дзеці Зямлі, – але ў кожнага ёсць свой асаблівы куток на ёй. Што ўсе мы нарадзіліся ў нейкі гістарычны час, – але за кожным з нас паўстае вечнасць. Прайшлі і пройдуць многія вякі – а ўраджай з іх збіраць мастакам слова. Бацькаўшчына адна, але іх, радзім чалавека, шмат на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зямлі. Як шмат на ёй людзей. Для адных – гэта ваўкавыскія, магілёўскія, слуцкія землі, для іншых – мінулае, адраджэнню якога паэт прысвячае сваё жыццё. Для адных – горад, для другіх – вёска…

Дзякуючы мастацкаму твору, новыя пакаленні не толькі даведаюцца пра жыццё іншых, але і змогуць спачуваць, перажываць разам з героямі. М. Багдановіч нарадзіўся недалёк да Раства, да Новага года. І гэтае прадчуванне свята, асаблівая зачараванасць казачным светам засталася ў яго душы назаўсёды.

Калі чалавек сэрцам успрымае нейкую рэч, хаця б і матэрыяльную, калі ён дакранаецца струнамі сваёй душы да нечага іншага, хаця б і нежывога, – усё гэта ажывае ў ім, набывае новае жыццё ў радках паэта. “… і адчуваю полымя жывое…”, – пісаў Максім Танк, дакранаючыся да кнігі Максіма-папярэдніка. Жывое ідзе ад жывога, ад сэрца, ад душы. Аб гэтым – аб прысутнасці жывога ў хвіліны натхнення, аб адухаўленні нежывога ў мастацкім свеце творцы – піша таксама Максім Танк: “Кладу свае далоні – / І адчуваю полымя жывое” [4, с. 389], “Вы думаеце, гэта – шчасце, / Калі ад дотыку твайго / Ператвараецца ўсё ў песню: / Зямля, трава, вада, агонь…” [4, с. 374]. І вершы Багдановіча лёгка ператвараюцца ў песню: спяваем мы “Ізноў пабачыў я сялібы…”, і “Зорку Венеру…”, і “Пагоню”, нібыта агучваючы і даючы адказ на асабістыя душэўныя зрухі і хваляванні, духоўную смагу, прагу прыгожага, “вечнага”, неабсяжнага.

Прысутнасць у кнізе таго, што “перадаецца” з ёю ад пакалення да пакалення, што праходзіць праз дзесяцігоддзі, назавем адзнакай (“звышякасцю”) цэласнасці мастацкага свету “Вянка”. Такой прыкметай з’яўляецца пэўны стан ўспрымання, калі адчуваеш “полымя жывое”. Трапна вынайдзены Максімам Танкам вобраз “полымя жывога” дазваляе акрэсліць гэтую “звышякасць” адзінай Кнігі Багдановіча. “Полымя жывое” – гэта зерне, якое, будучы ўкінутым у глебу, нараджае колас, шмат каласоў, калі “жыццёвая іх сіла ўзбудзілася”… Гэта тое, што прымушае ваду рухацца з-пад зямлі на паверхню і што нараджае крыніцы, рэчкі, азёры, каб наперад “з глебы на прастор прабіцца”… Гэта тое, што абуджае агонь у стоенай душы чалавека – і “ўзрушаны нарэшце дух народны” [1, 1, с. 137]… І гэта тое, “з чаго расце душа чалавека”, – самы галоўны адказ на самае галоўнае пытанне. Гэта пытанне, як і адказ, былі сфармуляваны і зададзены менавіта Максімам, агучаны вуснамі яго Ісуса Хрыста (“Прытча аб васільках” [1, 2, с. 59]). Гэта формула – “тое, з чаго расце душа чалавека”, – пытанне і адначасовы адказ Паэта-класіка на ўсе найноўшыя і будучыя дасягненні і выклікі чалавечай цывілізацыі.

Кніга “Вянок” – краевугольны камень у падмурку духоўнасці, культуры, прыгажосці…

Мастацкі твор як “другая рэальнасць”, уключаючыся ў “першую рэальнасць”, у якой жыве чалавек, уплывае на яе, гэтаксама як і сама нараджаецца пад уплывам жыцця. “Другая рэальнасць” перадае не толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з’явы навакольнага свету. Яна (і гэта самае галоўнае) нясе с сабой водар – водар Бацькаўшчыны, якая ёсць і родны кут, і Беларусь, і наш агульны дом Зямля. Перадаць, узнавіць у будучым, у прасторах Сусвету пачуцці і перажыванні жывога чалавека, – гэта пад сілу толькі творцам. І толькі творцам з вялікай літары.

Найбольш дакладная ацэнка прагрэсу мае духоўнае, маральна-этычнае вымярэнне. Змяняецца аблічча таго, што будуецца на зямлі, аднапавярховыя драўляныя дамы змяніліся 5-ці, затым 9-ці, 26-ціпавярховымі… Але гэта толькі вонкавае аблічча Бацькаўшчыны. Сапраўднае, “вечнае” яе аблічча фарміруецца тым кавалкам сэрца, тою часткай душы, якая ўкладзена ва ўсе гэтыя манументальныя праекты.

Духоўнасць, прыгажосць, высокая культура – гэта і ёсць той сапраўдны падмурак Бацькаўшчыны, які “не разбіць, не спыніць, не стрымаць” [1, 1, с. 315]…

Літаратура:


1. Багдановіч, М.А. Поўны збор твораў : у 3 т. / М.А. Багдановіч ; Акад. навук Беларусі, Ін-т літ. ; рэдкал.: В.В. Зуёнак [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992–1995. – Т. 1 / рэд. А.А. Лойка. – 1992. – 751 с. ; Т. 2. – 1993. – 600 с.
2. Гумилев, Л.Н. Поиски вымышленного царства / Л.Н. Гумилев. – М. : Айрис-Пресс, 2009. – 432 с.
3. Данте, А. Божественная комедия / А. Данте ; пер. с итал. М. Лозинского.– Минск: Маст. літ., 1987.– 574 с.
4. Танк, М. «Мне пару крыл дало юнацтва...» : выбр. лірыка / М.Танк ; уклад. В. Рагойшы. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.
5. Фолкнер, У. Речь при получении Нобелевской премии У. Фолкнер // Писатели США о литературе. – М. : Прогресс. – Т. 2. – 1982. – 451 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ